УДК [94(476.4):34]"1772/1796"

# СУДОВЫЯ ЎСТАНОВЫ МАГІЛЁЎСКАЙ ГУБЕРНІ Ў ПЕРЫЯД ПРАЎЛЕННЯ КАЦЯРЫНЫ II (1772–1796 гг.)

Гушчынскі Ігар Генадзьевіч
намеснік дэкана факультэта дашкольнай адукацыі
Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта
імя Максіма Танка;
кандыдат гістарычных навук, дацэнт
(г. Мінск, Беларусь)

*Магілёўская губерня была ўтворана ў выніку далучэння ўсходнебеларускіх зямель да Расіі паводле 1-га падзелу Рэчы Паспалітай, які адбыўся ў 1772 г. У перыяд праўлення Кацярыны II мясцовая сістэма судовых органаў падверглася значным пераўтварэнням, накіраваным на яе ўпарадкаванне, узмацненне дзяржаўнага кантролю над ёй, а таксама ўкараненне тут мадэлі судаўладкавання па расійскаму ўзору. Найбольш важным мерапрыемствам у дадзеным накірунку стала ўвядзенне ў 1778 г. "Учреждений об управлении губерний Всероссийския империи".*

Пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай (1772 г.) далучаныя да Расіі беларускія землі былі ўключаныя ў склад зноў створаных Магілёўскай і Пскоўскай губерняў (у дакументах яны таксама называліся агульным тэрмінам "беларускія губерні"). У дадзеным дакладзе ўвага сфакусіравана на судовых установах на тэрыторыі Магілёўскай губерні ў перыяд праўлення Кацярыны II (г. зн. да канца 1796 г.).

На момант далучэння да Расіі функцыі правасуддзя тут выконвалі земскія, гродскія, падкаморскія суды, а таксама магістраты і ратушы. Яны дзейнічалі на падставе ў першую чаргу Статута ВКЛ 1588 г., а таксама сеймавых канстытуцый Рэчы Паспалітай і некаторых няпісаных прававых традыцый. Пасля ўключэння ў склад Расіі мясцовая судовая сістэма падверглася пераўтварэнням.

У маі 1772 г. Кацярынай II было абвешчана, што тут будзе захавана ажыццяўленне правасуддзя паводле мясцовых норм і правілаў (г зн. III Статута ВКЛ, пастаноў Сейма Рэчы Паспалітай, судовай практыкі), а таксама на польскай мове [1]. Першапачаткова былі захаваныя і самі папярэднія судовыя ўстановы.

Аднак ужо ў верасні–кастрычніку 1772 г. у Магілёўскай губерні, якая была падзелена на правінцыі, былі створаны па расійскаму ўзору губернская і правінцыйныя канцылярыі [2; 3]. Гэта былі мясцовыя органы ўлады, якія сумяшчалі ў сабе функцыі адміністрацыйнага кіравання і суда. На іх ускладалася функцыя правасуддзя па крымінальных справах, што азначала паглынанне юрысдыкцыі гродскіх судоў [4]. У той жа час для разгляду грамадзянскіх спраў пакідаліся ў дзеянні земскія і падкаморскія суды, а таксама магістраты ў гарадах [5, с. 304, 310].

8 мая 1773 г. Кацярына II зацвердзіла даклад Сената, паводле якога ў Магілёўскай губерні уводзіліся губернскі і правінцыйныя земскія суды. Да іх пераходзілі функцыі правасуддзя па грамадзянскіх справах. Адпаведна, з пачаткам іх працы павінны былі спыніць дзейнасць земскія і падкаморскія суды. Губернскі і правінцыйныя земскія суды дзейнічалі на падставе мясцовага права і выкарыстоўвалі ў судаводстве польскую мову. Іх склад выбіраўся мясцовым дваранствам з свайго асяродку на тэрмін 4 гады [4].

22 ліпеня 1773 г. Кацярынай II быў зацверджаны даклад беларускага генерал-губернатара Захара Чарнышова, у якім прадугледжвалася раздзяленне правінцый на паветы і ўвядзенне пасад павятовых камісараў (па 2 на правінцыю). Сярод абавязкаў камісараў, якія знаходзіліся ў падпарадкаванні правінцыйных канцылярый, было вырашэнне цяжбаў паміж сялянамі, калі сума іску не перавышала 25 рублёў. Пры гэтым спрэчкі пазямельнага характару ім былі непадсудны [6].

Тым часам расійскім урадам вялася праца па падрыхтоўцы карэннай рэформы сістэмы мясцовага кіравання ў імперыі ўвогуле. Гэта знайшло ўвасабленне ва "Учреждениях для управления губерний Всероссийския империи" [7] (далей – "Учреждения..."), падпісаных Кацярынай II 7 лістапада 1775 г. Аднак адкрыццё новых устаноў магло адбыцца толькі пасля неабходных падрыхтоўчых мерапрыемстваў. У прыватнасці, неабходнай умовай для паспяховага ўкаранення "Учреждений..." было папярэдняе азнаямленне насельніцтва з іх зместам. Аднак руская мова на той момант у краі яшчэ не мела дастаткова шырокага распаўсюджання. Таму было неабходна перакласці "Учреждения..." на больш зразумелую, прынамсі для шляхты, польскую мову, і выдаць іх. Пераклад быў зроблены мясцовым каталіцкім біскупам Станіславам Сестранцэвічам. У пачатку 1777 г. у Магілёве быў надрукаваны яго тыраж, а сам Сестранцэвіч атрымаў за гэта ад імператрыцы залатую табакерку [5, с. 100–101].

Непасрэднае адкрыццё новых адміністрацыйных і судовых устаноў паводле "Учреждений..." у Магілёўскай губерні адбылося ў чэрвені 1778 г. [8]. Новая судовая сістэма насіла яскрава выяўлены саслоўны характар. Асобныя судовыя установы прадугледжваліся для дваран, гарадскіх саслоўяў і непрыватнаўласніцкіх сялян.

Для дваран судом 1-й (ніжняй) інстанцыі з'яўляліся павятовыя суды, якія знаходзіліся ў павятовых гарадах. Пры павятовых судах знаходзіліся дваранскія апекі. Яны займаліся пытаннямі апякунства над сіротамі, удовамі, састарэлымі,



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

недзеяздольнымі, марнатраўцамі з ліку дваран, кіравання вымарачнымі маёнткамі і інш. 2-й (сярэдняй) судовай інстанцый для дваран з'яўляўся Магілёўскі верхні земскі суд.

Для гарадскіх саслоўяў (купецтва і мяшчанства) судом 1-й інстанцыі былі гарадавыя магістраты. Пры іх дзейнічалі сірочыя суды, якія фактычна былі аналагам дваранскіх апек. Трэба адзначыць, што магістраты хаця і існавалі раней, але з увядзеннем "Учреждений..." іх колькасць значна вырасла [5, с. 108]. Яны павінны былі дзейнічаць у кожным павеце, а не толькі гарадах, надзеленых прывілеямі на самакіраванне. У той жа час першапачаткова не былі створаны магістраты ў Быхаве і Сянно, бо тыя хоць і мелі статус гарадоў і з'яўляліся адміністрацыйнымі цэнтрамі паветаў, але знаходзіліся на прыватнаўласніцкіх землях [5, с. 320]. Апеляцыйнай інстанцыяй для гарадавых магістратаў і сірочых судоў быў Магілёўскі губернскі магістрат.

Існавалі адмысловыя саслоўныя суды і для непрыватнаўласніцкіх сялян (аднадворцаў, дзяржаўных, манастырскіх і некаторых інш.). Судом 1-й інстанцыі для іх былі ніжнія расправы. Закон не прадугледжваў для іх размяшчэння жорсткай тэрытарыяльнай прывязкі да пэўных адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак. Вызначаць колькасць і месцазнаходжанне ніжніх распраў павінен быў генерал-губернатар. У Магілёўскай губерні яны былі створаны толькі ў Магілёве і Чэрыкаве [5, с. 109]. Паводле "Учреждений..." судом 2-й інстанцыі для згаданых катэгорый сялян былі верхнія расправы, якія знаходзіліся ў губернскіх гарадах.

Склад усіх згаданых саслоўных судоў 1-й і 2-й інстанцыі фарміраваўся пераважна па выбарным прынцыпе – ад адпаведных саслоўяў. Па прызначэнні замяшчаліся пасады толькі старшынь ніжніх і верхніх распраў (адпаведна, губернскім праўленнем і Сенатам), а таксама старшынь губернскіх магістратаў (Сенатам).

У Магілёве знаходзіліся суды 3-й (верхняй) інстанцыі – палаты грамадзянскага і крымінальнага суда. Яны разглядалі справы ўсіх саслоўяў. Кожная з палат складалася са старшыні, 2-х саветнікаў і 2-х асэсараў. Гэтыя суды былі цалкам каронннымі, без элементу выбарнасці.

Асобна ад апісанай 3-ступенчатай судовай сістэмы мясцовых судоў дзейнічаў Магілёўскі "совестный" суд. Паводле "Учреждений..." яму былі падсудны справы, у якіх меліся змякчальныя для абвінавачанага абставіны, а таксама грамадзянскія цяжбы, калі за вырашэннем спрэчкі звярталіся адразу абодва бакі. У склад "совестного" уваходзілі суддзя (у якасці старшыні), якога прызначаў генерал-губернатар, і 6 засядацеляў (выбарных па 2 ад кожнага саслоўя) [7].

Такім чынам, у 1778 г. у Магілёўскай губерні была ўведзена расійская сістэма судовых органаў. Але гэта не азначала спынення дзеяння III Статута ВКЛ, сеймавых канстытуцый Рэчы Паспалітай і выкарыстання польскай мовы ў судах. Прынамсі гэта датычыла грамадзянскага судаводства выбарных судоў 1-й і 2-й інстанцый. Таму грамадзянскі судовы працэс тут значна адрозніваўся ад агульнарасійскага. У беларускіх губернях ён быў спаборным, а ва ўнутрырасійскіх – следчым (інквізіцыйным). З гэтага вынікала яшчэ адна яскравая асаблівасць мясцовага правасуддзя – наяўнасць адвакатуры.

Пасля смерці Кацярыны II ў канцы 1796 г. на расійскі трон узышоў яе сын Павел I, які значна змяніў урадавую палітыку па многіх накірунках. У прыватнасці, Магілёўская і Полацкая губерні былі аб'яднаны ў адну Беларускую губерню (з цэнтрам у Віцебску) [9]. Замест уведзеных пры Кацярыне II паводле "Учреждений..." судовых устаноў тут у агульных рысах была вернута сістэма судаўладкавання перыяду ВКЛ і Рэчы Паспалітай [10, с. 428]. Узнаўлялася дзейнасць земскіх (пад назвай земскіх павятовых) і падкаморскіх судоў. Для выканання ў губерні функцый, адпаведных колішняму Трыбуналу ВКЛ, ствараўся Магілёўскі галоўны суд.

Такім чынам, у перыяд праўлення Кацярыны II сістэма судовых органаў Магілёўскай губерні падверглася значным пераўтварэнням, накіраваным на яе ўпарадкаванне, узмацненне дзяржаўнага кантролю над ёй, а таксама ўкараненне тут мадэлі судаўладкавання па расійскаму ўзору. Найбольш важным мерапрыемствам у дадзеным накірунку стала ўвядзенне ў 1778 г. "Учреждений об управлении губерний Всероссийския империи". Аднак пасля смерці імператрыцы яе сынам Паўлам I у агульных рысах была адноўлена сістэма судаўладкавання ўзору часоў ВКЛ і Рэчы Паспалітай.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**


1. ПСЗРИ. – Собр. 1. – Т. 19. – 1770–1774. – № 13808.
2. ПСЗРИ. – Собр. 1. – Т. 19. – 1770–1774. – № 13866.
3. ПСЗРИ. – Собр. 1. – Т. 19. – 1770–1774. – № 13879.
4. ПСЗРИ. – Собр. 1. – Т. 19. – 1770–1774. – № 13977.
5. Жукович, П. Н. Управление и суд в Западной России в царствование Екатерины II : [сб. отд. публ. из разн. номеров Журн. М-ва народ. просвещ.] / П. Н. Жукович. – Б. м. : б. и., 1914. – 235 (разд. паг.) с.
6. ПСЗРИ. – Собр. 1. – Т. 19. – 1770–1774. – № 14014.
7. ПСЗРИ. – Собр. 1. – Т. 20. – 1775–1780. – № 14392.
8. ПСЗРИ. – Собр. 1. – Т. 20. – 1775–1780. – № 14774.
9. ПСЗРИ. – Собр. 1. – Т. 24. – 1796–1797. – № 17634.
10. Нольде, Б. Э. Очерки русского государственного права / Б. Э. Нольде. – СПб. : Тип. «Правда», 1911. – 554 с.




Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова